ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 9 (496) | Субота, 20 сакавіка 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**ЗА ВЫДАТНЫЯ ЗАСЛУГІ, ВЯЛІКІ АСАБІСТЫ ЎКЛАД У СПРАВУ АХОВЫ МІРУ, УМАЦАВАННЯ ДРУЖБЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ НАРОДАМІ ГЕНЕРАЛЬНАМУ САКРАТАРУ ЦК КПСС, СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР Л. І. БРЭЖНЕВУ ЎРУЧАНЫ ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ СУСВЕТНАЙ ФЕДЭРАЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ.**

# НАДЗЕЙНАЯ АПОРА ПАРТЫІ

## НА XVII З'ЕЗДЗЕ ПРАФСАЮЗАЎ СССР

Школай кіравання, школай гаспадарання, школай камунізму сталі ў нашай краіне прафсаюзы. Свой абавязак і прызванне яны бачаць у тым, каб служыць надзейнай апорай партыі ў масах, актыўна садзейнічаць развіццю сацыялістычнай дэмакратыі, уцягваць працоўных у вялікую справу камуністычнага будаўніцтва.

Шматгранная, плённая дзейнасць савецкіх прафсаюзаў наглядна пацвярджае, наколькі павышаюцца іх ролі і значэнне ва ўмовах развітога сацыялізму. Да свайго XVII з'езда прафесіянальныя саюзы прыйшлі ва ўсеўзброенні вопыту і ведаў, цесна згуртаваныя вакол КПСС і яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта, поўныя рашучасці і ў далейшым быць вернымі памочнікамі партыі. У цэнтры ўвагі вышэйшага прафсаюзнага форуму, які пачаў работу 16 сакавіка ў Маскве, — шляхі далейшага ўдасканалення дзейнасці самай масавай з грамадскіх арганізацый у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

11 гадзін раніцы. Бурнымі, працяглымі апладысментамі віталі прысутныя таварышаў **Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, М. С. Гарбачова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. Я. Пельшэ, М. А. Ціханава, К. У. Чарненку, П. Н. Дземічава, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, М. С. Саломенцава, І. В. Капітонава, У. І. Далгіх, М. В. Зімяніна, К. В. Русакова.**

XVII з'езд прафсаюзаў СССР адкрыў старшыня ВЦСПС С. А. Шалаеў.

Аднадушна, з вялікім уздымам выбран ганаровы прэзідыум з'езда ў саставе Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым.

На нашым з'ездзе, сказаў старшыня ВЦСПС, прысутнічаюць кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Усе яны аднадушна выбраны дэлегатамі XVII з'езда прафсаюзаў. Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты прамоўца ад імя дэлегатаў і гасцей з'езда сардэчна вітаў членаў Палітбюро ЦК КПСС на чале з верным сынам партыі і народа, выдатным палітычным і дзяржаўным дзеячам сучаснасці Леанідам Ільічом Брэжневым. Прамоўца таксама вітаў кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК КПСС, сакратароў ЦК КПСС, іншых кіраўнікоў.

С. А. Шалаеў паведаміў, што для ўдзелу ў рабоце з'езда савецкіх прафсаюзаў прыбыла 131 дэлегацыя са 123 краін. Дэлегацыі прадстаўляюць 160 нацыянальных прафцэнтраў і 8 міжнародных арганізацый. Ад імя прафсаюзаў СССР ён горача вітаў зарубежных сяброў, пасланцоў рабочага класа ўсіх кантынентаў.

Мы зноў пацвярджаем, сказаў старшыня ВЦСПС, што савецкія прафсаюзы нязменна стаялі і ў далейшым будуць цвёрда стаяць на пазіцыях пралетарскага інтэрнацыяналізму і салідарнасці з рабочым класам і прафсаюзамі іншых краін у імя вырашэння ў інтарэсах людзей працы карэнных пытанняў нашага часу.

Дэлегаты выбралі кіруючыя органы з'езда — прэзідыум, сакратарыят, рэдакцыйную і мандатную камісіі.

Зацвярджаецца павестка дня і парадак работы з'езда. На разгляд яго дэлегатаў унесены наступныя пытанні:

1. Справаздача аб рабоце ВЦСПС і задачы прафесіянальных саюзаў СССР у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС.
2. Справаздача Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.
3. Выбары Усесаюзнага Цэнтральнага Савета Прафесіянальных Саюзаў.
4. Выбары Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Слова атрымлівае Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР **Л. І. Брэжнеў.** Дэлегаты і госці з'езда сустракаюць Леаніда Ільіча стоячы, бурнай, доўгай не змаўкаючай авацыяй.

Прысутныя ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў з велізарнай увагай выслухалі прамову таварыша Л. І. Брэжнева «Клопаты аб людзях працы, клопаты аб вытворчасці — у цэнтр увагі прафсаюзаў». Яна неаднаразова перапынялася бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Затым з'езд пачаў разгляд першага пункта павесткі дня. З дакладам «Справаздача аб рабоце ВЦСПС і задачы прафесіянальных саюзаў СССР у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС» выступіў старшыня ВЦСПС **С. А. Шалаеў.**

На вячэрнім пасяджэнні 16 сакавіка дэлегаты заслухалі справаздачу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі прафсаюзаў. З дакладам выступіла старшыня камісіі **Е. Ф. Гугіна.**

Затым пачалося абмеркаванне справаздачных дакладаў ВЦСПС і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

# У СТУДЭНТАЎ—НАВАСЕЛЛЕ







Пачалося засяленне 13-павярховага інтэрната кватэрнага тыпу універсітэта, узведзенага ў мікраранёне Валатава. Яго навасёламі стануць студэнты эканамічнага і біялагічнага факультэтаў. Для жыхароў інтэрната прадугледжаны добрыя ўмовы: утульныя пакоі, сталовая на 150 пасадачных месцаў, вялікая чытальная зала і інш.

**На здымках:** 1. Агульны выгляд новага студэнцкага інтэрната. 2. Утульна і прыгожа ў пакоях. 3. У сталовай.

Фота **У. Чысціка.**





# У ПРАЦОЎНЫ ШЛЯХ

Вясной у студэнтаў-выпускнікоў так многа хваляванняў, што цяжка вызначыць нешта найбольш важнае .Але на першым месцы, бясспрэчна, стаіць размеркаванне. Яно завяршае пяцігадовую вучобу ва універсітэце. Яго чакаюць і самі студэнты, і выкладчыкі. На гэтым тыдні пачала сваю працу дзяржаўная камісія. Яе задача вельмі адказная і ганаровая: правесці размеркаванне такім чынам, каб, у першую чаргу, задаволіць патрэбы народнай гаспадаркі ў спецыялістах неабходнай кваліфікацыі.

Перад камісіяй—выпускнікі эканамічнага факультэта спецыяльнасці «эканоміка працы». Без перабольшвання можна сказаць, што гэта адна з самых адказных у народнай гаспадарцы спецыяльнасцей. Нямногім больш як праз чатыры месяцы сёлетнія выпускнікі эканамічнага факультэта прыступяць да працы на прадпрыемствах і ў арганізацыях усіх абласцей нашай рэспублікі, у Архангельску, Ніжневартаўску.

У Архангельск паедзе Вольга Рабчыкава, у Ніжневартаўск — Валянціна Лабанава. Муж і жонка Леанід Рудзеня і Святлана Далгова будуць працаваць у Брэсце на электрамеханічным заводзе. Кацярына Раманюк зойме пасаду эканаміста ў саўгасе «Чырвоны сцяг» Баранавіцкага раёна. Спецыялісты з дыпломамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта будуць працаваць у Магілёве ў вытворчым аб'яднанні «Хімвалакно», у Полацку на заводзе шкловалакна, на шклозаводзе «Нёман».

На гэтым тыдні размеркаванне ішло і на іншых факультэтах універсітэта.

(Наш кар.).

**НА ЗДЫМКАХ:** працуе дзяржаўная камісія; выпускніца, выдатніца вучобы Інга **КАВАЛЕНКА** замацоўвае сваім подпісам рашэнне дзяржаўнай камісіі аб накіраванні яе на работу.

Фота **У. Чысціка.**




# ПАД СІЛУ МЕХАНІЗАТАРСКАЯ ПРАЦА

Студэнцкія механізаваныя атрады — адзін з новых напрамкаў у маладзёжным будаўнічым руху, закліканы аказваць эфектыўную дапамогу ў развіцці сельскай гаспадаркі. Упершыню такі атрад быў створаны ў ГДУ па ініцыятыве камітэта камсамола ў 1978 годзе. Тады ж байцы атрада на першым сваім сходзе пастанавілі: змагацца за прысваенне ганаровага звання імя 60-годдзя ВЛКСМ, залічыць у свой атрад нашага славутага земляка лётчыка-касманаўта СССР Пятра Клімука. Байцы атрада заваявалі гэтае званне і вось ужо на працягу пяці працоўных семестраў даказваюць сваімі справамі права яго насіць. Яны працуюць так жа напружана і натхнёна, як гэта рабіў П. Клімук у космасе.

Залог поспехаў механізаванага студэнцкага атрада (МСА) у мэтанакіраванай падрыхтоўцы байцоў у перыяд фарміравання атрада, у іх гатоўнасці да вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці. Пачынаючы з 1978 і па 1981 год уся работа атрада ў гэты перыяд праходзіла пад знакам падрыхтоўкі да 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна, 35-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, 60-годдзя з дня нараджэння Ленінскага камсамола Беларусі, дастойнага выканання рашэнняў XXVI з'езда КПСС. Усе байцы МСА паспяхова выканалі свае сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя на гэты перыяд: павысіць паспяховасць па грамадскіх і спецыяльных дысцыплінах, праводзіць навуковыя даследаванні, удасканальваццa ў спорце.

Байцы атрада прымалі ўдзел у вучобе ўсіх катэгорый кіраўнікоў і актыву студэнцкіх атрадаў: камандзіраў, камісараў, агітатараў, рэдактараў насценгазет і інш. У падрыхтоўчы перыяд атрадная агітбрыгада прымала ўдзел у аглядзе-конкурсе агітбрыгад СБА універсітэта, лектарская група чытала лекцыі перад студэнтамі, працоўнымі горада, наладжваліся сустрэчы з ветэранамі 79-га гвардзейскага Мазырскага авіяцыйнага палка. Працавалі байцы атрада на будаўніцтве і рэканструкцыі завода «Гомсельмаш».

Першаступеннае значэнне ў падрыхтоўчы перыяд набывае падбор будучых байцоў механізаванага атрада. Патрабаванні ж да іх асаблівыя: студэнты павінны мець прафесіі сельскіх механізатараў — трактарыстаў, камбайнераў, рамонтнікаў, мець правы на ваджэнне аўтамабіля. Камітэт камсамола універсітэта за апошнія гады набыў пэўны вопыт у справе падбору і расстаноўкі кадраў студэнцкага механізаванага атрада. Як правіла, кожны першакурснік праходзіць субяседванне з членамі камітэта камсамола. Разам з многімі цікавячымі нас пытаннямі, мы абавязкова высвятляем, ці мае студэнт прафесію сельскага механізатара. Імёны ўсіх, хто калі-небудзь працаваў на сельскагаспадарчых машынах, мы заносім у спецыяльную картатэку. Яна і з'яўляецца галоўнай нашай дапамогай у час фарміравання механізаванага атрада. У дапаўненне да гэтага ў вучэбных карпусах, інтэрнатах універсітэта вывешваем афішы-заклікі, у якіх запрашаем усіх, хто жадае працаваць у механізаваных атрадах, прыходзіць у камітэт камсамола.

Агульная колькасць атрада не перавышае 15 чалавек. Мэтазгоднасць менавіта такога саставу пацвярджаецца пяцігадовай практыкай работы ў гаспадарках. Камандзір атрада, як правіла, прызначаецца з ліку выкладчыкаў ці супрацоўнікаў універсітэта. Гэта звязана, перш за ўсё, з небяспечным характарам работы, неабходнасцю вельмі дакладнага выканання ўсіх патрабаванняў тэхнікі бяспекі, агульнай дысцыпліны.

Работы, якія прадастаўляюцца атраду, штогодна мяняюцца. У адпаведнасці з гэтым мяняецца і якасны састаў атрада. Так, напрыклад, калі у адным годзе для гаспадаркі, з якой быў заключаны дагавор, патрабавалася больш вадзіцеляў для адвозкі зерня ад камбайнаў на зернеток, у атрад уваходзілі да 60—70 працэнтаў вадзіцеляў. У другім годзе трэба было адвозіць зялёную масу ў сіласныя ямы і патрабаваліся, галоўным чынам, трактарысты. Таму пры фарміраванні атрада камітэт камсамола, камандзір атрада зыходзяць з прапануемых гаспадаркай работ, уключаюць у састаў атрада тых студэнтаў, якія валодаюць неабходнымі ў даны момант прафесіямі. Калі ў атрадзе ёсць механізатары розных спецыяльнасцей, то ўжо можна ствараць уборачна-транспартныя звенні. Звенні ж, як вядома, дазваляюць аператыўна правесці работы па ўборцы ўраджаю, эфектыўна выкарыстоўваць тэхніку, дабівацца высокіх вытворчых паказчыкаў.

Тры гады запар мехатрад універсітэта працаваў у калгасе імя Лебедзева Веткаўскага раёна, і усе гэтыя тры гады яго работа атрымлівала высокую адзнаку кіраўніцтва гаспадаркі: граматы, прэміі, падзякі, вымпелы пераможцаў у сацыялістычным спаборніцтве. У мінулым сезоне мехатрад працаваў у саўгасе «Навабеліцкі» Гомельскага раёна. І зноў работа байцоў атрада была высока ацэнена: кожнага ўзнагародзілі граматай дырэкцыі, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый, грашовай прэміяй. А калі атрад вярнуўся ва ўніверсітэт, на імя рэктарата, парткома і камітэта камсамола універсітэта прыйшоў ліст з падзякай за дапамогу. Адначасова дырэкцыя саўгаса запрашала атрад на ўборку бульбы і выказвала пажаданне заключыць доўгатэрміновы дагавор на некалькі сезонаў. Гэта вышэйшая адзнака работы атрада, лепшае прызнанне яго неабходнасці, карыснасці.

**У. ЧМЫХ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола.**

*Работу арганізуе савет*

# МАЛАДЫЯ ВУЧОНЫЯ Ў ПОШУКУ

Ужо больш дзесяці гадоў існуе ва універсітэце савет маладых вучоных. Яго роля ў жыцці навуковай моладзі універсітэта ўзрастае з кожным годам. Мы знаходзім для сябе ўсё новыя аспекты работы. Гэта і прыцягненне моладзі да паглыбленай навуковай дзейнасці, і да грамадскай працы, выхаваўчая работа. Калі гаварыць больш падрабязна, дык паглыбленне навуковай дзейнасці — гэта ўнутрыуніверсітэцкія конкурсы на лепшую апублікаваную работу. Такія конкурсы маюць сваёй мэтай з аднаго боку наогул актывізацыю навуковых пошукаў, з другога — садзейнічаюць у падрыхтоўцы да абароны кандыдацкіх дысертацый. Пераможцы конкурсаў заахвочваюцца граматамі, прэміямі. Зараз рыхтуемся да навуковай канферэнцыі «Кастрычніцкія чытанні», якую плануем зрабіць традыцыйнай. На канферэнцыі пройдзе апрабіраванне ўжо падрыхтаваных навуковых работ, іх абмеркаванне. Прычым, зрабіць гэта мяркуем на самым высокім узроўні, з удзелам вядучых вучоных.

Па ініцыятыве ЦК ВЛКСМ шырокай практыкай сталі Усесаюзныя школы маладых вучоных і спецыялістаў па разнастайных галінах ведаў. У рабоце такіх школ па сваіх галінах ужо ўдзельнічалі С. У. Аўсеенка, асістэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, В. М. Верамееў, асістэнт кафедры заалогіі і дарвінізму, аўтар гэтых радкоў. Зараз рыхтуюцца выступіць са сваімі працамі на занятках Усесаюзных школ асістэнт кафедры АМАЭІ А. А. Цяпічава і асістэнт кафедры агульнай фізікі У. Ф. Шолах.

Ідэйна-выхаваўчая работа мае разнастайныя формы: грамадскія даручэнні, удзел у лекцыйнай рабоце, наладжванне шэфскіх сувязей. У лекцыйнай рабоце пераважае прафарыентацыйны напрамак. Проста выдатна ў гэтым плане наладжана работа «Школы маладога геолага», кіруе якой загадчык геалагічнага музея М. І. Аўтушка. Прычым на геалагічным факультэце будучых абітурыентаў і студэнтаў арыентуюць не проста на выбар канкрэтнай прафесіі, але на навуковы падыход да яе.

Усё гэта прыносіць свой плён, бо ў працэсе падрыхтоўкі да любога выступлення — ці гэта будзе навуковы форум, ці лекцыя перад аўдыторыяй школьнікаў, рабочых — мы вучымся самі.

Па выніках рэспубліканскага этапу сёмага Усесаюзнага конкурсу работ маладых вучоных па грамадскіх навуках асістэнт кафедры гісторыі СССР і усеагульнай гісторыі В. П. Пічукоў і аўтар гэтых радкоў удастоены дыпломаў лаўрэатаў другой ступені і грашовых прэмій. Тэма работы В. П. Пічукова была «Прыёмы актывізацыі навучання школьнікаў (па матэрыялах вывучэння гісторыі ў сёмым класе)». Для сваёй конкурснай работы я выбраў тэму: «XXVI з'езд КПСС аб асаблівасцях дыялектыкі аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ва ўмовах развітога сацыялістычнага грамадства».

Уся праца нашага савета — гэта пошук. Пошук новых, найбольш аптымальных форм работы, цікавага і карыснага для нас вопыту з тым, каб навуковае жыццё нашай навучальнай установы было больш рэзультатыўным, каб у аўдыторыі прыходзілі лектары з вялікім запасам ведаў, уменнем данесці іх да студэнтаў.

**Р. МІНЯНКОЎ,**
**старшыня савета маладых вучоных і спецыялістаў універсітэта, кандыдат філасофскіх навук.**

# САЮЗ НЕПАРУШНЫ РЭСПУБЛІК СВАБОДНЫХ




## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ЛЕКЦЫЙ, ДАКЛАДАЎ, ГУТАРАК ДА 60-ГОДДЗЯ СССР

60-годдзе СССР — свята дружбы і брацтва ўсіх савецкіх народаў.

Шэсць дзесяцігоддзяў працы і перамог.

Стварэнне СССР — працяг справы Вялікага Кастрычніка.

Утварэнне СССР — трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У. І. Ленін — заснавальнік і кіраўнік савецкай шматнацыянальнай дзяржавы.

СССР — сацыялістычная Айчына ўсіх народаў нашай Радзімы.

Савецкі народ — новая гістарычная супольнасць людзей.

КПСС — авангард савецкага народа.

У адзінстве з народам — сіла партыі.

У адзінстве з партыяй, у яе кіраўніцтве — сіла народа.

Вялікая пераўтваральная сіла марксізму-ленінізму, пралетарскага інтэрнацыяналізму.

КПСС — партыя інтэрнацыяналістаў-ленінцаў.

XXVI з'езд КПСС аб далейшым умацаванні дружбы народаў СССР.

Творчае развіццё КПСС ленінскага вучэння па нацыянальнаму пытанню.

Л.І. Брэжнеў аб Радзіме, аб інтэрнацыяналізме і дружбе народаў.

Канстытуцыя СССР — увасабленне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі.

Развіты сацыялізм — гістарычная заваёва ўсіх народаў СССР.

Сацыяльна - палітычнае і ідэйнае адзінства савецкага грамадства.

Дзяржава моцная свядомасцю мас.

Рабочы клас — вядучая сіла інтэрнацыянальнага згуртавання народаў.

Развіццё нацыянальных адносін ва ўмовах развітога сацыялізму.

60-годдзе СССР — свята сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

Дружба народаў СССР — магутная крыніца творчасці мас.

Далейшае збліжэнне нацый і народнасцей СССР.

Адзіны народнагаспадарчы комплекс — матэрыяльная аснова дружбы народаў СССР.

РСФСР — першая сярод роўных.

Наша рэспубліка ў XI пяцігодцы.

Масква — сталіца Савецкага Саюза.

БАМ — будоўля ўсенародная.

Заходняя Сібір — Радзіме.

Пераўтварэнне Нечарназем'я — справа ўсіх рэспублік СССР.

Наш калектыў — часцінка вялікага шматнацыянальнага брацтва.

Інтэрнацыянальныя сувязі нашага калектыву.

Мы дружбай ленінскай моцныя.

Агульнанародны характар сацыяльнай палітыкі КПСС.

Клопаты партыі аб шчасці народа.

Усё для чалавека, усё ў імя чалавека.

Каб лепш жыць — трэба больш і лепш працаваць.

Поспехі савецкай навукі.

Росквіт і ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных культур.

Руская мова — мова вялікага брацтва народаў.

Мы — савецкі народ.

Мы — патрыёты, інтэрнацыяналісты.

Перавагі сацыялістычнай дэмакратыі.

Увага да людзей — важная рыса ленінскага стылю работы.

Сацыялістычны ўклад жыцця — вялікі здабытак савецкіх народаў.

Савецкая дзяржава — гэта ўлада працоўных.

Саветы народных дэпутатаў — палітычная аснова СССР.

Савецкія прафсаюзы — уплывовая масавая арганізацыя працоўных.

Ленінскі камсамол — школа патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання моладзі.

Савецкая Армія — армія дружбы народаў.

Абарона сацыялістычнай Радзімы — свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР.

Міжнароднае значэнне ўтварэння і паспяховага развіцця СССР.

Развіццё сусветнай сацыялістычнай сістэмы.

Садружнасць брацкіх краін сацыялізму.

Міралюбівы, інтэрнацыяналісцкі характар знешняй палітыкі СССР.

Антынародная сутнасць сучаснага імперыялізму.

Праграма міру на 80-я гады — у дзеянні.

Агрэсіўным імкненням імперыялізму — цвёрды адпор.

Абвастрэнне нацыянальных супярэчнасцей пры капіталізме.

Савецкі Саюз — надзейны аплот народаў у барацьбе за мір, незалежнасць, сацыяльны прагрэс.

Савецкі Саюз — паслядоўны барацьбіт супраць каланіялізму, неаканаліялізму і расізму.

Нацыяналізм — зброя падрыўной дзейнасці імперыялізму.

Павышаць рэвалюцыйную пільнасць савецкіх людзей, іх класавую свядомасць.

Прыгажосць і веліч чалавека працы.

Памножым наш уклад у стварэнне матэрыяльна - тэхнічнай базы камунізму.

Вырашэнне харчовай праблемы — задача агульнанародная.

Жывёлагадоўля — ударны фронт.

Працаваць эфектыўна і якасна, з поўнай аддачай сіл — наш патрыятычны і інтэрнацыянальны абавязак.

Беражліва выдаткоўваць сыравіну, матэрыялы, электраэнергію, паліва.

Рашуча змагацца з недахопамі, умацоўваць працоўную дысцыпліну.

Вышэй сцяг сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае выкананне планаў XI пяцігодкі!

Выканаем і перавыканаем заданні 1982 года.

Азнамянуем кожны дзень юбілейнага года ўдарнай творчай працай.

Рашэнні XXVI з'езда КПСС — выканаем!

60-годдзю СССР — дастойную сустрэчу!